пу: 1939–1941/ М.И. Мельтюхов. – 2-е изд., испр. и доп. М.,2002.
2. Откровения и признания. Нацистская верхушка о войне «Третьего рейха» против СССР/ Под ред. Г.Я. Рудой. Смоленск, 2000.
3. *Сиполс В. Я.* Торгово-экономические отношения между СССР и Германией в 1939–1941 гг. в свете новейших архивных документов // Новая и новейшая история. 1997. №2. С.29–42.
4. *Случ С. З.* Советско-германские отношения в сентябре-декабре 1939 г. и вопрос о вступлении СССР во Вторую мировую войну // Отечественная история. 2000. №6. С. 10–27.
5. *Фолькман Х.*-Э. Советский Союз в экономических расчетах «третьего рейха»// Отечественная история.1997. №2. С. 27–38.
6. Интернет-адрес: http://www.tuad.nsk.ru/history/Author/Russ/su/Shevakov/Article/sheviak/htm.
7. Интернет-адрес: http://www.specnaz.ru/article/?705.

## ПАЛІТЫЧНЫЯ І САЦЫЯЛЬНЫЯ АСПЕКТЫ Ў АСЭНСАВАННІ МІНУЛАГА Ў ВКЛ У XV–XVI стст.

**Я. С. Глінскі**

Мінулае, яго рэпрэзентацыя, былі важным элементам у грамадска-палітычным жыцці Вялікага княства Літоўскага. Першая маштабная акцыя па прыцягненню гістарычных аргументаў да рэчаісных спраў адносіцца да 30-х гг. XV ст., калі прыхільнікі Жыгімонта Кейстутавіча паспрабавалі абгрунтаваць яго прыход да ўлады, знітаваўшы яго з дзейнасцю Вітаўта. Так, насуперак агульнапрынятаму меркаванню [6, с. 148; 7, с. 107; 8, s. 18; 12, s. 39, 44, 48], першая частка «Летапісца вялікіх князёў літоўскіх», верагодна, не была інспіравана Вітаўтам, куды большую цікавасць у акцэнтуацыі даўно мінулых падзей мог мець Жыгімонт Кейстутавіч, а дакладней, прыхільнікі вяртання Кейстутавічаў да ўлады. Адсюль націск на супрацоўніцтва Кейстута і Альгерда, Вітаўта і Ягайлы (натуральна, да вайны Ягайлы з Кейстутам), адсюль спробы па магчымасці абяліць Ягайлу (напрыклад, не ён, як гэта пададзена ў «Мемарыяле Вітаўта» [4, с. 95], а яго дарадца Вайдыла «почал в нѢмьци собѢ соимы чинити и записыватися грамотами противу великого князя Кестута» [5, с. 85]) і пры гэтым апраўдаць Кейстута і Вітаўта. Таксама падчас вайны 1432–1436 гг. сталай падтрымкай крыжакоў карыстаўся Свідрыгайла, а «Летапісец» мае выразную антыкрыжацкую скіраванасць (у вусны Кейстута ўкладзена: «с кимь мы ся воюемь? С немьци. Они с ними Полоцька добывають. Уже то проявилося, што они на нас полно стали с немьци» [5, с. 62]).

У той жа час паказ мінулага мог быць і выказам лаяльнасці, як гэта адбылося са смаленскім летапісаннем, куды пасля перамогі Жыгімонта былі ўнесены прыхільныя Кейстутавічам творы – Аповяд пра падзеі 1432–1436 гг. і «Пахвала Вітаўту». Але створаны ў 30–40-я гг. XV ст. вобраз мінулага Вялікага княства быў далёка няпоўны, што было адной з

прычын стварэння «рымскай легенды» ў другім зводзе.

Акрамя таго, «рымская легенда» мела сярод сваіх перадумоў і зацікаўленасці магнацкіх родаў у выкладзе сваёй генеалогіі. Падвышэнне свайго паходжання патрабавалася перадусім магнатам Гаштольдам і князям Гальшанскім, якія ў першай палове XVI ст. адыгравалі вялікую ролю ў палітычным жыцці, але не былі ані Гедымінавічамі, ані Рурыкавічамі. Таму зразумела іх імкненне вывесці сябе, па-першае, ад рымлян, па-другое, з аднаго гербу ці з бакавой лініі у дачыненні да дынастыі Ягелонаў. Гэта, аднак, не было ўзняццём прэстыжу ўсяго кола «літоўскіх паноў», як лічыць А. Латышонак [10, s. 32], гэта быў твор акрэсленай палітычнай групы. Такая легенда выклікала пэўную негатыўную рэакцыю, перш за ўсё, Гедымінавічаў. Так, у глосе са Слуцкага спісу, звязанага з Гедымінавічамі – князямі Слуцкімі Алелькавічамі, даецца вывад Гальшанскіх не ад міфічнага Гольшы – брата вялікага князя, а ад баярына XIV ст. – Альгімонта [5, с. 7].

Але «рымская легенда» служыла і для ўзвялічвання ВКЛ як дзяржавы. Хаця б з таго, што выводзіла літвінаў з Рыму і давала ім гісторыю «ад пачаткаў» (што было вельмі важна для XVI ст.). Яшчэ яна ў пэўнай ступені легітымізавала доўгатрывалае паганства літвінаў, якое было мішэнню крыжацкіх памфлетаў [14, s. 16]: па-першае, вызнавалі літвіны сваю рэлігію «подле рымского обычаю» [5, с. 146], па-другое, «ачколвек поганы были, а въжды потом себе знаменали и в Бога одного вѢрыли, иж судныи день мѢл быти, и вѢрыли з мертвых въстаню и одного Бога, которы мѢл судити жывых и мертвых» [5, с. 149].

Як бачым, «рымская легенда» была творам поліфункцыянальным. Гэтаму не выпадае здзіўляцца, бо яе інспіратары не толькі (а нават і не столькі) вырашалі прыватныя пытанні, а таксама абгрунтоўвалі, «стваралі» слыннае мінулае ВКЛ у няпростых умовах XVI стагоддзя.

«Рымская легенда» у прынцыпе можа разглядацца як літоўская этнагенетычная, але ніякай «рускай» этнагенетычнай легенды не паўстала. Гэта наўрад ці можа быць растлумачана адсутнасцю «рускіх» інтэлектуальных сіл – працавалі яны ж і над беларуска-літоўскімі летапіснымі зводамі. Відаць, не бачылі яны небяспекі ў «рымскай» легендзе і асэнсоўвалі сябе як частку ВКЛ. Магчыма, у «рускім» асяроддзі ВКЛ існавала слаба аформленая «кіеўская легенда» – Рагвалодавічы, князі Друцкія на старонках другога летапіснага зводу выведзены ад кіеўскіх Рурыкавічаў [5, с. 146].

Рэлігійны фактар не адыграваў вялікага значэння ва ўспрыняцці мінулага аж да часоў Рэфармацыі. Смаленскія кніжнікі прыхільна ставіліся да каталіка Вітаўта, бо быў іх панам, у стварэнні «рымскай легенды» і «Хронікі Быхаўца» прымалі ўдзел праваслаўныя. Менавіта эпоха Рэфармацыі і Контррэфармацыі павысіла значэнне рэлігійнага

фактару пры інтэрпрэтацыі мінулага: Аўгустын Ратундус ухваляе Ягайлу менавіта за яго трыванне ў каталіцкай веры і г.д. Аднак, уплыў рэлігійных пачуццяў самога аўтара, як гэта адбылося ў выпадку з Міколай Гусоўскім, мог паспрыяць своеасабліваму ўспрыманню мінулага – прыпісванню яго дзеячам (у выпадку «Песні пра зубра» – Вітаўту [2, с. 64]) уласнай рэлігійнасці.

Па сацыяльным складзе галоўнымі замаўляльнікамі «гісторыі» былі магнаты, толькі ў панаванне Жыгімонта II Аўгуста была спроба стварыць «ягелонскую» гісторыю ВКЛ, чаму выказам з'яўляліся працы «Размова паляка з літвінам» і «Кароткі аповяд пра князёў Літвы», верагодным аўтарам якіх лічыцца Аўгустын Ратундус. У гэтых творах, што вельмі паказальна, знікла схема «княжа і 500 рымскай шляхты», засталася толькі дынастыя, якая выводзілася ад рымскіх патрыцыяў [9, s.94–104]. Аднак, і ў працах Ратунда адчуваецца відавочнае спрыянне магнатам Радзівілам – іх «цезка» (продак?) уведзены ў шэрагі вялікіх князёў [11, s. 68].

Тым не менш, «магнацкае» бачанне мінулага шырока распаўсюдзілася: выразнік інтарэсаў шляхты Міхалон Літвін пазычае гістарычную інфармацыю з тых жа прамагнацкіх летапісаў: напрыклад, пра хана Ачкірэя, пасланага ў Крым з ВКЛ [3, с. 64–65], паход Альгерда на Маскву [3, с. 93], бітву пры Хойніцы [3, с. 94].

Канчатковую эксплікацыю гісторыі ВКЛ здзейсніў Мацей Стрыйкоўскі ў сваёй «Хроніцы». Ён падкрэсліваў, што з'яўляецца першым, хто выведзе слынную гісторыю ВКЛ з цемры няведання [13, s. XXXIX]. Пры разуменні рытарычнасці такога лозунгу, заўважым, што, напрыклад, у Даніі падобныя ідэі выказваліся храністамі яшчэ ў XII ст. [1, с. 3–6] Як бачым, стварэнне «вялікага наратыву» па гісторыі Вялікага княства Літоўскага адбылося дастаткова позна, на што паўплывалі позняе прыняцце хрысціянства кіруючай дынастыяй, а значыць і магчымасць для выкарыстання ёй усяго плёну пісьмовай культуры, наяўнасць моцных гістарыяграфічных традыцый Польшчы і Русі, якія ў пэўнай ступені замянялі «літвінскую». Не апошнюю ролю адыграла і працяглая адсутнасць «дзяржаўнай», «дынастыйнай» гісторыі Вялікага княства Літоўскага. М. Стрыйкоўскі здолеў сумясціць уласныя погляды, прамагнацкія дадаткі, выказ павагі да дынастыі і ўніі з Польшчай. Магчыма, гэта атрымалася ў яго (не адмаўляючы таленту храніста), дзякуючы вельмі высокай павазе да крыніц (таму змяшчаў без вялікіх ваганняў супрацьлеглыя версіі) і наяўнасці ў храніста ўласнай канцэпцыі мінулага [13, s.XLIII] – выдатнай эпохі, нашмат лепшай за сучасную яму.

**Літаратура**


1. *Антонов В. А.* Историческая память датчан и генеалогические изыскания в Дании в XII веке // Восточная Европа в древности и Средневековье: XIII Чтения памяти

чл.-корр. АН СССР В.Т. Пашуто / Ред. кол. Е.А. Мельникова (отв. ред.) и др. М., 2001. С. 3–6.
2. *Гусоўскі М.* Песня пра зубра: паэма / Пер. с лацінск. мовы і пaслясл. Я. Семяжона; Іл. А. Кашкурэвіча. Мн., 1973.
3. *Литвин М.* О нравах татар, литовцев и москвитян / Пер. В. И. Матузовой; Вступ. ст. М. В. Дмитриевой; Коммент. С. В. Думина и др. М., 1994.
4. «Мемарыял Вітаўта» – першая хроніка Вялікага княства Літоўскага / Уступ, пер., камент. А. Ліцкевіч // Беларуская думка. 2009. Люты. С. 92–96.
5. Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; Отв. ред. Б.А. Рыбаков. Т. 35: Летописи белорусско-литовские / Сост., авт. предисл. и ред. т. Н.Н. Улащик. М., 1980.
6. *Сушицький Т.* Західньо-руські літописи як пам'ятки литератури / Ред. В. Перетц; Упорядк. та до друку вигот. О. А. Назаревський; Всеукр. акад. наук Київ, 1929. (Праці з історіі письменства давньої України; Т. 1).
7. *Чамярыцкі В. А.* Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў / Рэд. Я.С. Лур'е; Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Янкі Купалы. Мінск, 1969.
8. *Jakubowski J.* Studya nad stosunkami narodowościowemi na Litwie przed Unią Lubelską. Warszawa, 1912.
9. Kroniczka Książąt Litewskich 1576 r. // Jakubowski J. Studya nad stosunkami narodowościowemi na Litwie przed Unią Lubelską. Warszawa, 1912. S. 94–104.
10. *Łatyszonek O.* Polityczne aspekty przedstawienia średniowiecznych dziejów ziem białoruskich w historiografii Wielkiego Księstwa Litewskiego XV–XVI w. // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 2006. №25. S. 5–44.
11. Rozmowa Polaka z Litwinem / Wyd. J. Korzeniowski. Kraków, 1890.
12. *Smolka S.* Najdawniejsze pomniki dziejopisarstwa rusko-litewskiego: rozbiór krytyczny. Kraków, 1899.
13. *Stryjkowski M.* Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego: 2 t. / Przedmowy M. Malinowskiego, I. Daniłowicza. Warszawa 1846. T. 1. 1846.
14. *Zachara-Wawrzyńczyk M.* Geneza legendy o rzymskim pochodzeniu Litwinów // Zeszyty Historyczne / Uniw. Warszawski. Warszawa, 1963. T. III. S. 5–35.

## РАЗВИТИЕ ДЕЛОВОГО ТУРИЗМА В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

**В. А. Казакова**

Туризм Беларуси является составной частью национальной экономики и социально-культурной жизни страны. Его современное состояние характеризуется разнообразием форм, видов и разновидностей. Одним из самых прибыльных и перспективных направлений туристической индустрии сегодня можно назвать деловой туризм – путешествия со служебными или профессиональными целями без получения доходов по месту временного пребывания [3, с. 7]. В структуре делового туризма можно выделить два сегмента – классические деловые поездки (КДП) и сегмент, который образует англоязычная аббревиатура MICE: (M – Meetings, «встречи»; I – Incentives, «поощрительные поездки»; C – Congresses, «конгрессы» или Conventions, «конференции»; E – Events, «события» или